ПРАКАВЕТНАЕ

# Ляцела страла ўздоўж сяла



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



У ВЕТКАЎСКІМ раёне адбыўся старажытны традыцыйны абрад «Ваджэнне і пахаванне стралы». Звычайна яго называюць каротка «пахаванне стралы». Несумненна, гэта ўнікальны помнік header нематэрыяльнай (духоўнай) культуры беларусаў Пасожжа. Больш «стралы» нідзе няма. Дагэтуль захаваны звычай і вераванне ў моц прыроды, зварот да яе праз песню.

— Страла павінна гучаць, — кажуць і жыхары вёсак, і спецыялісты этнафоніі — фальклarysты. Яны лічаць спевы «стралы» найвышэйшым узроўнем народнага выканальніцкага мастацтва. Нягледзячы на тое, што часам дождж паліваў, як з вядра, «стралу» вадзілі ў вёсках Стаўбун і Неглюбка, вадзілі танок — карагод і спявалі, і хавалі яе, як і належыць, у жытнёвым полі.

СТАР. 3

# Ляцела страла ўздоўж сяла



(Заканчэнне. Пачатак на 1 стар.)

***...Ты ляці, страла, ды ўздоўж сяла,***
***ды ўздоўж сяла ў канец вуліцы,***
***не ўбі, страла, добрага молайца,***
***па тым молайцу плакаць некаму...***

— спяваюць жанчыны, ідучы «сцяною» па вуліцы да скрыжавання, ведучы «стралу». Захавальніца і носьбітка старажытнага абраду вёскі Стаўбун Марыя Зуева не можа патлумачыць глыбінны сэнс гэтых слоў, але яна адчувае іх душою і душою спявае. У яе ўнікальны голас, кажуць фалькларысты, і на ёй сёння трымаецца «страла». Васьмідзесяцігадовая жанчына выконвае песні, як чула іх з маленства.



І гэтае выканальніцкае майстэрства імкнуцца пераняць і захаваць цяпер удзельніцы фальклорных гуртоў, якія заўсёды прыязджаюць на «стралу» з Мінска, Гомеля і нават Масквы. Дарэчы, масквічы лічаць «стралу» сваёй, чыста рускай з'явай, маўляў, калі абрад славянскі, значыць ён не можа быць іншым, як рускім.

— Ад Вялікадня да Ушэсця Бог ходзіць па зямлі, а на Ушэсце цягне каласы за валасы і адпраўляецца на неба, — кажа Марыя Лаўрэнцьеўна Зуева пра «стралу» на праваслаўнае Ушэсце і дадае: — Стралу вядуць за сяло, бо гэта грамавая страла, яна адводзіць ад вёскі маланкі, ад якіх гінуць людзі і загараюцца хаты.

Што ж хаваюць у жытнёвым полі ўдзельнікі абраду?

— Гэтага ніхто не павінен ведаць і бачыць, — кажа адзін з лепшых беларускіх даследчыкаў захавання старажытных абрадаў журналістка Рэгіна Гамзовіч. Яе шматгадовыя назіранні даюць падставу меркаваць, што хаваюцца найчасцей дробныя прадметы, напрыклад, пацеркі ці манеты. З прыгаворам: хаваю грошы на ўраджай харошы і людзям на здароўе!

Рэгіна Гамзовіч бачыць у сімвале абраду пераход дрэннай перуновай энергіі ў патрэбную людзям жыццясцвярджальную. У энергію жытнёвага поля, якое корміць, яго плоднасці. На жытнёвым полі качаюцца, каб набрацца сілаў на летнюю працу, каб падзяліцца з зямлёю-карміцелькай уласнаю сілай.

Ірына Глушэц, выпускніца Універсітэта культуры па спецыялізацыі этнафоназнаўства, сваёю дыпломную працу выбрала правядзенне «стралы» ў вёсцы Неглюбка і вырашыла застацца працаваць у Веткаўскім раёне дзеля захавання абрадаў Пасожжа і неглюбскага строю. Дзякуючы ёй сёлетняя «страла» абудзіла вёску гучнымі песнямі і прыгажосцю строяў.

Па традыцыі на Ушэсце ў Неглюбцы спраўляецца святочны абед з блінамі з крухмалу — «Богавымі анучамі», а ўвечары ідзе пагулянка пад гармонік і бубен з танцамі і прыпеўкамі.

На жаль, чарнобыльская катастрофа абязлюдзіла многія вёскі Веткаўшчыны і небеспадстаўна навукоўцы занепакоены захаваннем «стралы» там, дзе яе заўсёды вадзілі і хавалі.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**





